*кальвінскі збор*, *Навасвержанскі Петрапаўлаўскі касцёл*). З распаўсюджаннем у бел. архітэктуры ў 17—18 ст. стылявых тэндэнцый барока ў абліччы хрысціянскіх храмаў павялічвалася экспрэсія, выяўленая на фасадах кантрастам маштабаў і рытмаў, матэрыялаў і фактур, святлоценявымі эфектамі, падкрэсленая хвалістым характарам ліній, пышнасцю дэкар. аздаблення (касцёлы Св. Францішка Ксаверыя ў Гродне, Св. Андрэя ў Слоніме). Разам з тым будаваліся касцёлы ў традыцыях Сярэдневякоўя і Рэнесансу, іх архіт.-маст. кампазіцыі выражалі абарончы характар (*Камайскі касцёл Яна Хрысціцеля*, *Навагрудскі Фарны касцёл*). У канцы 18—19 ст. у К.з. увасобіліся рысы класіцызму, пачалі будавацца храмы крыжова-купальнага тыпу (*Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор*, *Петрыкаўская Мікалаеўская царква*), купальныя ратонды (*Чачэрская Праабражэнская царква*, *Пральніцкая Мікалаеўская царква*), базілікі (*Пружанскі сабор Аляксандра Неўскага*). У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. пад уплывам эклектыкі ў архітэктуры К.з. адзначаліся стылізатарскія тэндэнцыі, выражаныя ў неа- і рэтрастылях. Каталіцкія храмы будаваліся ў неагатычным стылі (*Гервяцкі Троіцкі касцёл*, *Суботніцкі касцёл Святога Уладзіслава*), збудаванні праваслаўнай канфесіі — у рэтраспектыўна-рус. стылі (*Гродзенскі кафедральны Пакроўскі сабор*, *Мількаўшчынская Пакроўская царква*). Драўляныя К.з. хрысціянскага веравызнання 16—19 ст. адзначаліся разнастайнасцю кампазіцыйнай будовы: праваслаўныя храмы мелі ў аснове падоўжна-восевую (царква Аляксандра Неўскага ў в. Стрэльна Іванаўскага р-на, *Паручынская Пакроўская царква*), ярусна-восевую (*Дварэцкая Святадухаўская царква*, *Дабраслаўская Троіцкая царква*), крыжова-цэнтрычную (*Вялікалазіцкая Пакроўская царква*) структуру, каталіцкія — форму базілікі з развітой аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй трохнефавага зрубу з трансептам (*Жырмунскі касцёл Адшукання Святога Крыжа*, касцёл Нараджэння Дзевы Марыі ў в. Кемелішкі Астравецкага р-на) або аднанефавай (*Вялікасвіранскі Юр'еўскі касцёл*). У 16 — пач. 20 ст. на тэр. Беларусі ўзводзіліся мураваныя (Ашмяны, Гродна, Столін, Слонім, Быхаў, Іўе) і драўляныя (Глыбокае, Воўпа, Нароўля, Навагрудак, Друя) сінагогі. У канцы 18 — пач. 19 ст. ў цэнтр. і паўн.-зах. рэгіёнах адзначалася шырокае будаўніцтва драўляных татарскіх мячэцей (Клецк, Ляхавічы, Мядзел, Мір, Іўе, Навагрудак, Слонім, Відзы). З пач. 20 ст. — 1980-я гг. К.з. амаль не ўзводзіліся. З актывізацыяй руху за нац. адраджэнне культ. спадчыны Беларусі пачала аднаўляцца дзейнасць праваслаўных і каталіцкіх храмаў, праводзіцца рэстаўрацыя і рэканструкцыя разбураных сакральных помнікаў, на месцы сапсаваных узводзяцца новыя. У 1990-я — пач. 2010-х гг. — ажыццяўляецца праектаванне і ўзвядзенне К.з. на новых месцах (Свята-Васкрасенская царква ў Брэсце, касцёл Узвышэння Святога Крыжа ў Светлагорску, пратэстанцкія малітоўныя дамы ў Ваўкавыску, Брэсце, мячэці ў в. Відзы Браслаўскага, г.п. Смілавічы Мінскага р-наў і інш.).

*Ю.Ю.Захарына.*

**КУЛЬТУ́РА** (лац. cultura апрацоўка, выхаванне, развіццё), гістарычна вызначаны ўзровень развіцця творчых сіл грамадства, чалавека, сукупнасць матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. У гісторыі і ў сучасную эпоху ў свеце існавала і існуе вял. разнастайнасць відаў К. як лакальна-гіст. форм супольнасцей людзей. Кожная К. ўвасабляе спецыфічны набор спосабаў сац. практыкі канкрэтна-гіст. супольнасці. Па структуры грамадскага жыцця вылучаецца маст., рэліг., прававая, паліт., эканам., навук., тэхн. К. Да найважнейшых сац. функцый К. адносяцца камунікатыўная, інтэграцыйная, нарматыўная, ігравая, кампенсаторная, пазнавальная, сацыялізацыі, захоўвання і перадачы культ. вопыту, мэтапакладання і інш. Найважнейшай функцыянальнай асаблівасцю К. як сістэмы з'яўляецца яе здольнасць да самаабнаўлення, пастаяннага ўзнікнення новых форм і спосабаў задавальнення інтарэсаў і патрэбнасцей людзей. Гіст. эвалюцыя К. прайшла шэраг стадый: першабытную, архаічную, даіндустрыяльную, постындустрыяльную. Кожная К. з яе прасторавымі і часавымі параметрамі цесна звязана са сваім творцам — народам. Яна адлюстроўвае спецыфіку ўкладу жыцця, паводзіны асобных груп, іх спосаб светаўспрымання ў міфах, легендах, сістэме рэліг. вераванняў і каштоўнасных арыентацый, якія надаюць сэнс існаванню чалавека. Як цэласную сістэму К. даследуе *культуралогія*, а яе падсістэмы і элементы — асобныя гуманітарныя навукі.

Бел. культура паводле этнічнага генатыпу належыць да агульнаслав. тыпу. Велізарны ўплыў на яе аказала хрысціянства, якое распаўсюджвалася пераважна мірным, эвалюцыйным шляхам. Гэта абумовіла гарманічны сінтэз хрысціянскай духоўнай К. і язычніцкай, прадстаўленай міфалогіяй, фальклорам, абрадавай і інш. традыцыямі. Для бел. К. характэрна памежнае становішча паміж двума цывілізацыйнымі тыпамі — ўсх.-візант. і зах.-еўрап. Яна нясе ў сабе рысы падабенства да К. Захаду і Усходу, але разам з тым мае свае нац. змест і форму. Спецыфічныя рысы бел. К. выразна прыкметныя ўжо ў эпоху Сярэдневякоўя. У 11—13 ст. высокага ўзроўню дасягнулі дойлідства, дэкар.-прыкладное і выяўл. мастацтва, пісьменнасць. У Полацку, Гродне і інш. гарадах сфарміраваліся своеасаблівыя архіт. школы, былі ўзведзены Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, Каложская царква ў Гродне, вежа ў Камянцы і інш. У 12 ст. ў Беларусі існавалі таксама самабытныя школы жывапісу. Да цяперашняга часу захаваліся фрэскі Полацкага Сафійскага сабора, Пятніцкай, Барысаглебскай і Дабравешчанскай цэркваў у Віцебску. Феноменам К. з'яўляецца паэма

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

«Слова аб палку Ігаравым», шэдэўрам маст. творчасці і ювелірнага мастацтва — *крыж Ефрасінні Полацкай* майстра Лазара Богшы. У 13—15 ст. адбылося фарміраванне старабел. мовы, арыгінальнай і перакладной л-ры, самабытных форм бел. абарончай архітэктуры, царк. жывапісу і музыкі, сінтэз культ. бел. традыцыі і дасягненняў зах.-еўрап. маст. К. Культ. жыццё 15 — 1-й пал. 18 ст. вызначалася станаўленнем бел. тыпу рэнесансавай К., развіццём бел. мовы, л-ры, тэатра, муз. і выяўл. мастацтва. Значны ўклад у развіццё гэтага тыпу К. ўнеслі Ф.Скарына, С.Будны, В.Цяпінскі, Мікола Гусоўскі, М.Сматрыцкі, Сімяон Полацкі, К.Лышчынскі, К.Нарбут, Я.Даманеўскі і інш. На развіццё бел. нац. К. ў 19—20 ст. вырашальны ўплыў аказалі ідэі нац.-вызваленчага руху. На аснове нар. гаворак і старабел. кніжнай традыцыі сфарміравалася сучасная бел. літ. мова. У л-ру, навуку, выяўл. мастацтва прыйшлі яркія творчыя асобы, якія арыентаваліся на духоўныя каштоўнасці народа. Творы Я.Чачота, В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча, Н.Орды, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, І.Хруцкага, Н.Сілівановіча, Ф.Рушчыца, М.Гарэцкага, І.Буйніцкага і інш. аказалі вял. ўплыў на фарміраванне нац. самасвядомасці, асэнсаванне гіст. спадчыны бел. народа, станаўленне нац. К. За гады сав. улады склалася развітая сістэма адукацыі, навукі, працягвала развівацца літ. творчасць, выяўл. мастацтва, музыка, тэатр, кінадраматургія, архітэктура. У творах П.Броўкі, Я.Коласа, У.Караткевіча, К.Крапівы, М.Лынькова, П.Панчанкі, М.Танка, К.Чорнага ўзняты глыбокія пласты нац. гісторыі, раскрыты багаты духоўны свет беларусаў, закранаюцца сац.-паліт. і маральныя праблемы. Бел. акцёры Г.Глебаў, М.Яроменка, І.Ждановіч, Б.Платонаў, В.Пола, Л.Ржэцкая, К.Саннікаў, З.Стома, С.Станюта і інш. стварылі непаўторную школу бел. тэатр. мастацтва. Творчасць кампазітараў М.Аладава, Ю.Багатырова, Г.Вагнера, І.Алоўнікава, П.Падкавырава, Р.Пукста, Н.Сакалоўскага, Я.Цікоцкага, Я.Глебава і інш. узбагацілa бел. муз. мастацтва. Мастакі і скульптары Беларусі З.Азгур, А.Анікейчык, І.Ахрэмчык, А.Бембель, С.Вакар, І.Давідовіч, Я.Зайцаў, М.Савіцкі і інш. пакінулі пасля сябе багатую маст. спадчыну. Значны ўклад у развіццё духоўнай і матэрыяльнай К. зрабілі бел. навукоўцы. У Беларусі склаліся вядомыя ў свеце навук. школы, якія працуюць у галіне філасофіі, мовазнаўства, матэматыкі, тэарэт. фізікі, спектраскапіі і люмінесцэнцыі, лазернай фізікі, электронікі, цеплафізікі, матэрыялазнаўства, геалогіі антрапагену, біяарганічнай хіміі, фізіялогіі, генетыкі і селекцыі, глебазнаўства, медыцыны і інш. Па розных праблемах К. былі выдадзены калект. і індывід. манаграфіі, энцыклапедыі, энцыклапедычныя даведнікі: «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» (т. 1—5, 1984—87), «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (т. 1—7, 1984—88), «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 1—6, 1987—94), «Музычны тэатр Беларусі» (кн. 1—4, 1990—97), «Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік» (т. 1—6, 1992—95), «Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік» (1993), «Беларуская мова» (1994), «Народнае мастацтва Беларусі» Я.Сахуты (1997), «Беларуская скульптура малых форм» В. Жука (1998), «Сучаснае дакументальнае кіно і культура Беларусі» (1999), «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (у 6 т., т. 1—2, 2001—04), «Тэатральная Беларусь» (т. 1—2, 2002—03), «Спадчына Беларусі» (2004), «Мастацкая культура Віцебскага Паазер'я» А.Русецкага (2005), «Беларускі фальклор» (т.1—2, 2005—06), «Гісторыя беларускай кнігі» (т. 1—2, 2009—11), «Помнікі літаратуры Беларусі X—XVIII стагоддзяў» І.Саверчанкі (2013).

*Літ.*: Лыч Л.М., Навіцкі У.І. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1996; Очерки истории науки и культуры Беларуси IX — нач. XX в. Минск, 1996; Смолік А.І. Культура Беларусі XI—XIX ст. Мінск, 1998; Яцкевіч А.Ф. Нацыянальная свядомасць, культура, мова. Брэст, 2000; Крукоўскі М.І. Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэт. культуралогію. Мінск, 2001; Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. Мінск, 2002; Народныя традыцыі і нацыянальная культура. Кн. 1—2. Мінск, 2001—03; Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. 2-е выд. Магілёў, 2003; Скараходаў У.П. Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі. Мінск, 2003; Межуев В.М. Классические концепции культуры // История культурологии. М., 2006; Жуковский В.И., Тарасова М.В. Культура как идеалофундированная система // Вопросы культурологии. 2013. № 1; Байдачная Е.В. Сущность экзистенционального поворота в культуре: на пути к осознанию // Вопросы культурологии. 2013, № 6; Огурцов А. П. Культура как способ самоописания современных обществ // Вопросы культурологии. 2013. № 6.

*А.І.Смолік.*

**«КУЛЬТУРА»**, грамадска-асветніцкая газета. Заснавальнік — Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь. Выдаецца з кастр. 1991 у Мінску на бел. мове штотыднёва. Інфармуе аб актуальных пытаннях дзярж. палітыкі ў галіне культуры, аб асн. кірунках мастацтва, у т.л. ў справе духоўнага фарміравання асобы і нацыі, захавання нац. гіст. культ. спадчыны, эстэтычнага выхавання, практычным вопыце работнікаў культуры, міжнар. праектах у сферы культуры і інш. Асвятляе грамадскае, культ. і сац. жыццё краіны, надзённыя праблемы сац.-культ. сферы сельскіх і раённых устаноў культуры, культ. інфраструктуры малых гарадоў, этна- і экатурызму і інш. Друкуе матэрыялы пад рубрыкамі «Соцыум», «Art-блог», «Трэба абмеркаваць!», «Дзяжурны па нумары», «На маю думку...», «Суботнія сустрэчы», «Форум», «Праекты развіцця», «На людным месцы», «Prof-партфоліа», «Беларусы свету», «ІПК: інстытут павышэння кваліфі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ